## ДУК “ВОРАНАЎСКАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭКА”

**11 красавіка** да Сусветнага дня авіяцыі і касманаўтыкі выставы – прагляд “Шлях да зорак сыноў Беларусі” арганізавала Пераганцаўская СБ, “Чалавек адчыняе сусвет” – Радунская ГПБ.

**17 красавіка** Воранаўская раённая бібліятэка арганізавала краязнаўча – турыстычны экскурс “Славутасці роднай зямлі”, прысвечаны Міжнароднаму дню памятнікаў і гістарычных мясцін. Бібліятэкары распавялі аб унікальных, таямнічых, чароўных месцах Беларусі. Удзельнікі сустрэчы паказалі свае веды пра родны край, яго славутасцях.

**15 мая** кніжнаую выставу “Кнігі для сямейнага чытання” прапанавала Канвелішская СБ.

**20 мая** на павышэнне ўзроўня інфармаванасці падлеткаў па праблеме ВІЧ/СНІД накіравана выстава – перасцярога “Вірус, які не ведае межаў” (Воранаўская ДБ).

**22 мая** да Дня славянскага пісьменства Воранаўская дзіцячая бібліятэка арганізавала выставу - вандроўку “Стваральнікі славянскага пісьменства”. Навучэнцы школ даведаліся пра гісторыю свята, асветніках беларускага народа — сусветна прызнаных асобах: Францыску Скарыне, Кірыле Тураўскім, Сімяоне Полацкім і падзвіжніцы кніжнай справы – святой Еўфрасінні Полацкай.

**28 мая** да Сусветнага дня без тытуню ў Воранаўскай раённай бібліятэцы прайшоў Дзень актуальнай інфармацыі “Мір без тытуневага дыму”. Бібліятэкары распавялі аб тым, якую шкоду тытунь наносіць здароўю чалавека. Падчас невялікага апытання прывялі прыклады шкодных звычак, якія ўплываюць на стан здароўя.

**5 чэрвеня** да Дня памяці Еўфрасінні Полацкай Канвелішская сельская бібліятэка запрасіла на віртуальнае падарожжа “Еўфрасіння Полацкая і яе жыццёвы шлях”, папчас якога чытачы пазнаёміліся з літаратурай пра жыццё Еўфрасінні, яе служэнне Богу і народу. Прападобная святая была не толькі адукаванным чалавекам, але і асветнікам-падвіжнікам, першым беларускім аратарам, прапаведнікам.

**26 чэрвеня** да Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй ў падтрымку здаровага ладу жыцця раённая бібліятэка правяла гутарку-агляд “Ілюзія свабоды, ці кайданы залежнасці”. Абмяркоўваліся прычыны, па якіх людзі ўжываюць наркотыкі.

## З ЛЮБОЎЮ ДА РОДНАГА КРАЮ
## (Да Году малой радзімы)

Фотавернісаж “Гісторыя вескі ў фотаздымках” арганізавала Больцішская ІСБ, краязнаўчая гадзіна “Іх імёны ў гісторыі вескі” прайшла ў Нацкай СБ.

## ТАЛЕНТЫ ЛІТАРАТУРНАГА СЛОВА

Адзначаліся літаратурныя юбілеі пісьменнікаў і паэтаў. Акрамя кніжных выстаў, тэматычных паліц, змястоўных гутарак, аглядаў чытачам былі прапанаваны віртуальныя выставы, відэа агляды. Віртуальная прэзентацыя “Кнігі – юбіляры 2020г.” звярнула ўвагу чытачоў на кнігі – юбіляры 2020 года, якія знаходзяцца ў фондах бібліятэк ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка”, каб правесці час з карысцю.

14 красавіка чытачам раёна была прапанавана віртуальная выстава – агляд твораў беларускага пісьменніка **Аляксея Карпюка** (1920-1992, Гродна), прысвечаная **100 – годдзю** з дня нараджэння юбіляра.

Віртуальныя выставы – агляды таксама былі прысвечаны **85 - годдзю** з дня нараджэння **Анатоля Клышкі** (1935) і **80 - годдзю** з дня нараджэння **В.А.Казько** (1940). Тэматычная паліца "Лёсам звязаны з Радзімай" (да 85-годдзя з дня нараджэння А.Клышкі афармлена ў Канвелішскай СБ.

Да **80 – годдзя** з дня нараджэння **Уладзіміра Ліпскага** (1940) Воранаўская дзіцячая бібліятэка сваім чытачам прапанавала падарожжа па творах пісьменніка пад назвай "Падорым дзецям сваю любоў".

Кніжныя паліцы "Выдатны пісьменнік Кузьма Чорны", прысвечаная **120 –**годдзю з дня нараджэння, і "Сінявокая зямля паэта", да **115** – годдзя з дня нараджэння **П.Броўкі**, аформлены ў Пераганцаўскай СБ, пазнаёмілі з творамі беларусніх класікаў.

## Бібліятэчныя праекты, акцыі

З **01.04 па 09.05.2020** бібліятэкі прынялі ўдзел у **абласной акцыі** "Чытаем разам", прысвечанай 75-годдзю Перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне.

У Воранаўскай раённай бібліятэцы стартаваў інтэрнэт – праект "Мы о войне стихами говорим…", прыняць ўдзел у якім мог кожны жадаючы: запісаць відэаролік з водзывам на любімую кнігу аб вайне або прачытаць верш і накіраваць на электронны адрас бібліятэкі. Відэаролікі былі размешчаны на сайце ДУК "Воранаўская раённая бібліятэка".

Аддзел абслугоўвання і інфармацыі прапанаваў сваім чытачам прыняць удзел у акцыі "Чытаем кнігі аб вайне". Працавалі кніжныя выставы "Гары, гары, агонь свяшчэнны, вечны, Як памяць наша, нашая любоў" і "Вайна… Вызваленне… Перамога". Бібліятэкары праводзілі сціслыя агляды твораў аб вайне, прынімалі ўдел у сумесным абмеркаванні прачытаных твораў.

У чэрвені далучыліся да абласнога інтэрнэт праекта "Кніжныя сустрэчы", прапанавалі сваім чытачам найбольш папулярныя "Кнігі для сапраўдных мужчын" з бібліятэчнага фонду бібліятэк раёна, лепшыя класічныя і сучасныя "Кнігі падлеткам", "Любімыя кнігі для жанчын".

У рамках абласнога інтэрнэт праекта "А ведаеце Вы, што…" прадстаўлены відэа ролікі, якія знаёмяць жыхароў Беларусі з прыгажосцю Воранаўскага краю, яго гісторыяй і сучаснасцю. Першы відэа ролік прысвечаны касцёлу святога Георгія (Юрыя) ў в. Асава, у гэтым годзе якому адзначаем 110 - гадовы юбілей. Кожны год у касцёле ладзяцца канцэрты арганнай музыкі. Старадаўні арган радуе парафіях сваімі цудоўнымі гукамі.

Другі відэа ролік прысвечаны каханню Адама Міцкевіча і Марылі Верашчакі, сустрэчы якія праходзілі ў маёнтку Путкаміраў у в. Больценікі. З творамі польскага паэта наведвальнікі могуць пазнаёміцца на кніжнай вытаве "Сцежкамі кахання Адама Міцкевіча", размешчанай у Больцініцкай СБ.

З мэтай павышэння прэстыжу кнігі, чытання і прыцягнення карыстальнікаў у бібліятэку стартаваў фотаконкурс "#Книга ВКадре", бібліятэчны блог "Библиотека без барьеров".

Воранаўская раённая бібліятэка, сумесна з сельскімі філіяламі распачынае бібліятэчны праект "Молодёжный ЧИТАЙмер", які ўключае ў сябе наступныя мерапрыемствы: чытанне ўраўкаў з кніг з музычным суправаджэннем, майстар – класы, творчыя нумары, конкурсы і шмат іншага. Мерапрыемствы будуць праходзіць на адкрытых пляцоўках кожную суботу.

28 чэрвеня, у День моладзі, адбылося адкрыццё праекта над назвай "АКТИВАЦИЯ…ВИРУС ЧТЕНИЯ". Для моладзі працавалі выстава "Бібліятэка

пакалення NEXT", фотазона "Молодежный ЧИТАЙмер", разыгрылася латарэя. Дадатковую інфармацыю можна знайсці на сайце бібліятэкі.

## РАБОТА З ДЗІЦЯЧЫМ ЧЫТАЧОМ.

На пачатку летніх канікул, як заўсёды, бібліятэкі раёна абвясцілі Праграму летняга чытання "Кніга ў летнім рукзаке", пазнаёмілі дзяцей з мерапрыемствамі, якія будуць для іх арганізаваны на працягу летніх канікул. Традыцыйна пачалася яна з марафона дзіцячай кнігі "Кніжныя спакусы лета", працуе на працягу года банка экспрэс – інфармацыі "Кніжны джэм" (для тых, хто не ведае, якую кнігу пачытаць наступнай).

Увага бібліятэкараў засяроджана на выхаванцах школьных лагераў адпачынку, з імі праводзіліся віктарыны, PR – акцыі, тэматычныя гутаркі, накіраваныя на папулярызацыю здаровага ладу жыцця, прававых ведаў, краязнаўства, правілам паводзін дзяцей на дарогах. Таксама дэманстраваліся электронныя прэзентацыі, слайд – рэпартажы, якія суправаджаліся гутаркамі.

Урок – казку "Мудрэц, з душой дзіцяці" прапанавала Пераганцаўская СБ.

Якія актуальныя сучасныя кнігі ўзяць з сабой у адпачынак? Як не толькі прыемна, але і з карысцю правесці летнія месяцы? На гэта пытанне дапамогло адказаць віртуальнае падарожжа "Лета з кніжкай у руках", арганізаванае Канвелішскай сельскай бібліятэкай.

Гульневую праграму "ПростоКаникулово" прапанавала для дзяцей аздараўленчага лагера ДУА "Беняконская СШ" Беняконская сельская бібліятэка – МЭ.

## МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ АБАРОНЫ ДЗЯЦЕЙ

Віртуальнае віншаванне атрымалі ў падарунак маленькія чытачы Воранаўскага раёна. Іх запрасілі прыняць удзел у відэа віктарыне "Мульт! Мульт! Мульт!", адказаць на пытанне "А якую кнігу выберыце Вы?" відэа віктарыны "Мая BOOK – сімпатыя".

## Да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

З мэтай захавання гістарычнай памяці і ў азнаменавання 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў бібліятэках установы былі аформлены кніжныя выставы, якія дазволілі пазнаёміцца з творамі мастацкай літаратуры, у якіх адлюстраваны лёс міліёнаў людзей ваеннага пакалення. Працавала віртуальная кніжная выстава "У сэрцах і кнігах – памяць аб вайне". Тэматычную выставу – прагляд "Дарогамі вайны" і конкурс малюнкаў "Дарогі вайны – дарогі Перамогі" прапанавала Пераганцаўская СБ.

**8 мая** супрацоўнікі Воранаўскай раённай і дзіцячай бібліятэк наведалі на даму сям'ю ветэрана Вялікай Айчыннай вайны С.А.Жука.

**9 мая** ў гарадскім парку працавала выстава "Гары, гары агонь свяшчэнны, вечны, як памяць наша, нашая любоў". Выстава змяшчала раздзелы, якія знаёмілі чытача з гераічным мінулым нашага краю ў гады Вялікай Айчыннай вайны, з ўражэнцамі краю на франтах вайны, пра героях вайны, імёны якіх звязаны з Воранаўшчынай.

## 22 чэрвеня - Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны.

Напярэдадні **22 чэрвены** наведвальнікі бібліятэк змаглі яшчэ раз звярнуцца да тэмы Вялікай Айчыннай вайны, наведаць кніжныя выставы пад агульнай назвай "Летапіс мужнасці". Адбыліся гадзіны памяці "Усім, хто спіць пад абеліскам, ты пакланіся нізка – нізка". Урок памяці "Гучаць званы памяці" прайшоў ў Беняконскай СБ – музей этнаграфіі.

## ДА ДНЯ ДЗЯРЖАЎНАГА ГЕРБА і ДЗЯРЖАЎНАГА СЦЯГА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Выставы – прагляды, тэматычныя паліцы дазволілі наглядна пазнаёміцца з гісторыяй дзяржаўных сімвалаў, якія сыходзяць каранямі ў глыбокае мінулае: "З гісторыі беларускіх сімвалаў" (Канвелішская СБ), "Наш герб і наш сцяг – гэта сімвалы свабоды" (Больцініцкая СБ), "Галоўныя сімвалы краіны" (Місявіцкая СБ), "Сімвалы незалежнасці" (Нацкая СБ) і інш.

## КАРЫСТАЛЬНІКАМ ПРАВАВЫЯ ВЕДЫ

Прававы дыялог "Закон і адказнасць" для падлеткаў арганізавала Жырмунская ІСБ. Падлеткі вучыліся аналізаваць учынкі з пунку гледжання правамернасці, актыўна выказвалі свае думкі і прымалі ўдзел у дыскусіі.

Круглы стол "Важная палітычная падзея нашага жыцця" (Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь) арганізаваны ў Беняконскай сельскай бібліятэцы – МЭ.

## ДА ДНЯ ЯДНАННЯ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Да гэтай даты ў бібліятэках раёна былі аформлены кніжныя паліцы: "Беларусь і Расія – нас яднае кніга" (Воранаўская РБ), "Саюзны вектар – шлях інтэргацыі" (Нацкая СБ).

## ВЫБІРАЕШ ПРАФЕСІЮ – ВЫБІРАЕШ ЛЁС

Скончыўся навучальны год. У дапамогу абітурыентам Воранаўская раённая бібліятэка прапанавала прэзентацыю "Інфармацыя для абітурыента", якая пазнаёміла з шэрагам карысных прафесій, каб аблегчыць выбар і накіраваць у патрэбнае русла.

## ПРА ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ.

У 2020 годзе бібліятэкамі працягваецца работа па бібліятэчнай праграме ***"Быць здаровым – гэта здорава" на 2016-2020гг.***

Бібліятэкары раёна далучыліся да сецявой акцыі "#СпасибоДоктор!" у падтрымку медыкаў. Віртуальная выстава "#МарафонБезПаники_БиблиотекиВороново" прапанавала падборку добрых кніг, артыкулаў па здароваму ладу жыцця; яшчэ раз указалі на тое, што трэба ведаць, каб знізіць заражэнне вірусам COVID-19, на правілы прафілактыкі.

Да Сусветнага дня здароўя Воранаўская раённая бібліятэка афарміла выставу – параду "Здароўе – багацце на ўсе часы", кніжную выставу – кірмаш рэцэптаў "Здаровым быць – гэта здорава" і выставу – прагляд "Стыль жыцця – здароўе" прапанавала Канвелішская СБ, урок здароўя "Вітамінка – жыцця сцяжынка" – Пераганцаўская СБ.

## СЯМ'Я – РАДУГА ШЧАСЦЯ

*(15 мая – Міжнародны дзень сям'і)*

Да гэтага свята былі прымеркаваны: відэа віншаванне "Любви чарующая сила" дырэктара установы ДУК "Воранаўская раённая бібліятэка" Камінскай Н.В., якая запрасіла наведаць кніжную выставу "Венец всех ценностей - семья", пазнаёміцца з цікавымі кнігамі і часопісамі для чытання ў крузе сям'і. Выстава працавала на працягу тыдня.

Віртуальная выстава "Калейдоскоп семейного досуга" пазнаёміла з перыядычнымі выданнямі, якія атрымлівае аддзел абслугоўвання і інфармацыі, і з якімі можна пазнаёміцца ў чытальнай зале раённай бібліятэкі.

## ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАЕ ВЫХАВАННЕ

Да 550 - годдзя цудатворнага набыцця нерукатворнага абраза – Жыровіцкай іконы Божай Маці настаяцель прыхода храма Святога князя Аляксандра Неўскага г.п.Воранава іерэй Ігар Валошын прапанаваў віртуальную гутарку – расказ аб найбольш шанаванай святыне ў Беларусі, прызнанай Праваслаўнай і Каталіцкай царквамі.

Бібліятэкі ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка” падрыхтавалі кніжныя выставы “Ікона Жыровіцкай Божай Маці – славянская святыня” і “ Дакраніся да мінулага: з’яўленне Жыровіцкай іконы Божай Маці”, прапанавалі тэматычную літаратуру, у якой адлюстравана гісторыя з’яўлення іконы.

Дню памяці Еўфрасінні Полацкай Воранаўская раённая бібліятэка прысвяціла віртуальную выставу “Небесная покровительница Отечества”.

## У ЗГОДЗЕ З ПРЫРОДАЙ.

Роля бібліятэк у экалагічнай асвеце насельніцтва адлюстроўваецца праз рэалізацыю мэтавай праграмы **“Наш дом - прырода” на 2016-2020гг**. Супрацоўнікі бібліятэк займаюцца распаўсюджваннем экалагічных ведаў, ажыццяўляюць экалагічную асвету, інфармуюць насельніцтва пра заканадаўства ў вобласці аховы навакольнага асяроддзя і экалагічнай бяспекі.

Да Сусветнага дня аховы навакольнага асяроддзя выставы – віктарыны “Птушыныя переразвоны”, выставы – прагляды “Увага! Птушкі Беларусі з Чырвонай кнігі” прайшлі ў Бастунскай інтэграванай, Пагародзенскай сельскіх бібліятэках, Воранаўскай ДБ.

Да ***Міжнароднага дня птушак*** гадзіну цікавых паведамленняў “Глушэц – птушка 2020 года” прапанавала Пераганцаўская СБ.

На летнюю экалагічную гульнёвую праграму “Экалагічная вандроўка” запрасіла Канвелішская сельская бібліятэка.

## ДЗЕНЬ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ТРАГЕДЫІ

Выстава-рэквіем “Чарнобыль – падзеі і ўрокі”, выстава – напамін “Чарнобыль у памяці і кнігах”, тэматычная паліца “Што нам пакінуў Чарнобыль?..” і “Чорны круг Чарнобыля” знаёмілі наведвальнікаў бібліятэк з дакументальнай і мастацкай літаратурай, перыядычнымі выданнямі, у якіх раскрыта тэма Чарнобыльскай трагедыі.

## АМАТАРСКІЯ АБ’ЯДНАННІ ЗАПРАШАЮЦЬ

“Народным традыцыям жыць і дужэць!”. Пад такой назвай прайшло чарговае паседжанне аматарскага аб’яднання “Святліца”, створанага пры Беняконскай сельскай бібліятэцы – музей этнаграфіі. Урак краязнаўства быў прысвечаны народным промыслам, менавіта ткацтву, якое і зарас застаецца актуальным і займае немалаважную ролю ў нашым жыцці. Засяродзелі ўвагу на беларускім арнаменце, беларускім рушніку, бо кожны рэгіён меў свой арнамент, свой узор, як сімвол поспеху і шчасця.